ТАЦЬЯНА МАКСІМАВА

# ВЫНІКІ 7-га КОНКУРСУ

# «Бібліятэка - асяродак нацыянальнай культуры»

***Савет садзейнічання бібліятэчнай справе Беларускага фонду культуры на сваім чарговым пасяджэнні падвёў вынікі 7-га рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры" за 1998 год.***

Усяго на конкурс было даслана 39 матэрыялаў ад бібліятэк і 6 – па намінацыях. Больш за ўсіх прадстаўлены цэнтральныя раённыя (13) і сельскія бібліятэкі (12).

Найлепшымі, як заўсёды, былі матэрыялы ад Мінскай і Брэсцкай абласцей, якія і на гэты раз вызначаліся высокім прафесіяналізмам і творчым падыходам да працы.

На прэміі вылучана 11 бібліятэк і 3 намінанты:

1. Пінская цэнтральная раённая бібліятэка імя Я.Янішчыц Брэсцкай вобласці – дырэктар **Суліма Валянціна Цімафееўна.**
2. Маларыцкая цэнтральная раённая бібліятэка Брэсцкай вобласці – дырэктар **Луцук Ніна Васільеўна.**
3. Жлобінская цэнтральная раённая бібліятэка Гомельскай вобласці – дырэктар **Яновіч Таццяна Леанідаўна.**
4. Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка Мінскай вобласці – дырэктар Лабастава Ганна Барысаўна.
5. Быхаўская раённая дзіцячая бібліятэка Магілёўскай вобласці – загадчыца **Зайкіна Валянціна Аляксандраўна.**
6. Бібліятэка саўгаса "Цяплічны" Гомельскай вобласці – загадчыца **Арэхава Людміла Аляксандраўна.**
7. Радзюкоўская сельская бібліятэка Шаркаўшчынскай ЦБС Віцебскай вобласці – загадчыца **Рымчонак Леаніда Станіславаўна.**
8. Азярэцкая сельская бібліятэка Глыбоцкай ЦБС Віцебскай вобласці – загадчыца **Мышкоўская Таццяна Аляксееўна.**
9. Рэкценская сельская бібліятэка Горацкай ЦБС Магілёўскай вобласці – загадчыца **Валчкова Любоў Елізараўна.**
10. Любкаўшчынская сельская бібліятэка Стаўбцоўскай ЦБС Мінскай вобласці – загадчыца **Федзяняк Наталля Канстанцінаўна.**
11. Бібліятэка Грэскай сярэдняй школы Слуцкага раёна Мінскай вобласці – бібліятэкар **Краўчына Тамара Аляксееўна.**

Па намінацыях:

1. За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем – **Чараўко Ірыну Дзмітрыеўну**, загадчыцу чытальнай залы Пінскай цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі Брэсцкай вобласці.
2. За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы – **Савельеву Таццяну Анатольеўну**, дырэктара Полацкай гарадской ЦБС Віцебскай вобласці.
3. За пошукавую і даследчую работу па напісанню гісторыі сваёй бібліятэкі – **Сачко Ліну Міхайлаўну, Кенька Таццяну Аляксандраўну, Макаранка Лідзію Іванаўну, Шаблінскую Вольгу Віктараўну** і іх гістарычны нарыс "Цэнтральная дзіцячая бібліятэка імя М.Астроўскага г. Мінска".

Самы актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні конкурсу прымае Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якое выдзеліла 100 мільёнаў рублёў на прэміраванне пераможцаў.



Азярэцкая СБ Глыбоцкай ЦБС.
Фрагмент "беларускай хаткі"

Спецыяльныя прэміі Беларускага фонду культуры атрымалі:

1. Складальнікі выніковага зборніка "Жывая памяць Клімаўшчыны: гісторыя развіцця бібліятэчнай справы ў Клімавіцкім раёне" Магілёўскай вобласці – **Сілівёрстава Антаніна Васільеўна і Сініцкая Людміла Рыгораўна.**
2. Навагрудская цэнтральная раённая бібліятэка Гродзенскай вобласці (дырэктар **Мішкіна Таццяна Мікалаеўна**) за арганізацыю і правядзенне конкурсу "Бібліятэкі – Адаму Міцкевічу" сярод бібліятэк сваёй сістэмы (53 філіялы) да 200-годдзя вялікага паэта.

Нельга не сказаць пра тыя бібліятэкі, якія не сталі пераможцамі, але маюць вялікі патэнцыял. Вельмі цікавыя матэрыялы даслала Рэчыцкая цэнтральная бібліятэка імя Н.К.Крупскай – летапіс бібліятэкі за 80 гадоў існавання ў трох альбомах. А ў Бераставіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы ў выніку шматгадовай работы падрыхтавана трохтомная кніга-хроніка "З гісторыі Бераставіччыны". Складальнік гэтага выдання – загадчык аддзела маркетынгу М.І.Пацэнка – у архівах, музеях і буйнейшых бібліятэках Беларусі знайшоў шмат дакументаў, звязаных з гісторыяй Бераставіц, запісаў успаміны ўдзельнікаў і сведкаў падзей. Беларускі фонд культуры прапанаваў Камітэту па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь узнагародзіць Бераставіцкую ЦРБ сваёй Ганаровай граматай.

Хацелася б адзначыць і матэрыялы дзвюх цэнтральных раённых бібліятэк Мінскай вобласці: Капыльскай бібліятэкі імя А.Астрэйкі і Маладзечанскай, якія крыху ўступілі пераможцам.

На гэты раз вельмі парадавала нас і бібліятэка прафкома Брэсцкага электралямпавага завода, якая абслугоўвае не толькі працуючых на прадпрыемстве, але і жыхароў горада і карыстаецца ў горадзе заслужаным аўтарытэтам.

Вынікі падведзены, але конкурс не спыняецца!

Наш конкурс – адзінае бібліятэчнае спаборніцтва ў краіне па адраджэнні беларускай нацыянальнай спадчыны. Таму дагэтуль ён не згубіў сваёй актуальнасці і папулярнасці сярод бібліятэк Беларусі. І мы, нягледзячы на цяжкасці, будзем знаходзіць магчымасці, каб працягваць і надалей конкурс "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры".